
Просто хорошая газета
Отдушина
12+
№27 (826) 1 июля 2020 года
Выходит один раз в неделю | Основана 18 октября 2002 года | Издатель УП «Газета Слонимская» | ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

НОВАЕ ВЫДАННЕ

Кніга мастака і паэта са Слоніма

У Слоніме на Чырвонаармейскай вуліцы жыве тутэйшы мастак і паэт Пятро Бурсевіч, якому сёлета споўніцца 84 гады.


Аўтапартрэт


Шасэйная вуліца ў Слоніме

За ўсё сваё жыццё Пятро Фёдаравіч не лез у вялікія мастакі і паэты. Ён сціплы і спакойны чалавек, працаваў, гадаваў дзяцей, займаўся хатняй гаспадаркай, а ў вольную хвіліну браўся за пэндзаль ці ручку і заўсёды маляваў, пісаў вершы. Маляваў людзей, якія жылі побач, краявіды, нацюрморты. І вучыў іншых, здольных да мастацтва, працаваць з пэндзлем і алоўкам. Ён і цяпер працуе ў сваёй невялікай хатняй майстэрні, а калі не малюецца, то стварае паэтычныя радкі, асабліва яму ўдаюцца сатырычныя вершы і апавяданні. Заўсёды з ім прыемна сустрэцца, пагутарыць, успомніць тых слонімцаў, якія яшчэ нядаўна жылі побач, але адышлі ў іншы свет.

Распавесці пра Пятра Бурсевіча сёння ёсць нагода. У Мінску з друку выйшаў вялікі альбом фарматам 60х848 Пятра Бурсевіча пад загалоўкам «Сцежкі-пуцявіны». Пад цвёрдай вокладкай на 165 старонках змешчаны не толькі ілюстрацыі яго карцін, малюнкаў, але і вершы, апавяданні, публікацыі пра яго творчасць, згадкі ў СМІ і г.д.

Пазнаёміў мяне з Пятром Бурсевічам слонімскі паэт Анатоль Іверс (1912-1999). Гэта Пятро Фёдаравіч некалі афармляў яго паэтычныя зборнікі вершаў «Травень» і «Прыдарожныя сосны». Гляджу сёння на вокладкі гэтых кніжак — і сэрца замірае: дужа шчымлівымі, блізкімі сэрцу атрымаліся малюнкі на вокладках. Асабліва да зборніка «Прыдарожныя сосны» , якія клічуць дадому, на Бацькаўшчыну, дзе нарадзіўся, дзе бегаў басаног, дзе, здаецца, шумяць гэтыя прыдарожныя сосны і сёння.

Альбом «Сцежкі-пуцявіны» адкрываецца партрэтамі свая-



Вокладка

коў Пятра Бурсевіча, якіх ён намаляваў, а таксама ксеракопіямі артыкулаў пра мастака. А ўпершыню пра жыхара вёскі Чамяры напісала слонімская раённая газета «За перамогу камунізму» ў сакавіку 1966 года. Пасля пісалі «Настаўніцкая газета», БЕЛТА, «Літаратура і мастацтва» і іншыя выданні.

Пятро Фёдаравіч працаваў на Слонімскай фабрыцы мастацкіх вырабаў, настаўнікам малявання ў школах Слоніма, кіраваў студыяй выяўленчага мастацтва ў слонімскім Доме піянераў. Ён вучыў юных мастакоў спасцігаць гэта складанае мастацтва. Разам яны арганізавалі сотні розных выстаў — ад раённых да рэспубліканскіх, прывозілі адтуль граматы і дыпломы. Сам Пятро Бурсевіч да сённяшніх дзён добра валодае тэхнікай малюнка. Яго заўсёды цікавіла родная Слонімшчына, людзі працы, барацьба з фашызмамі і прырода. І ўсё гэта адлюстравана на яго карцінах і малюнках. Як пісаў Анатоль Іверс у 1968 годзе, «любоў да роднай краіны, да людзей працы – гэта і ёсць душа мастака Пятра Бурсевіча».

ПРАЦЯГ НА С. 2 «АДДУШЫНЫ»

НА ПАЭТЫЧНАЙ ХВАЛІ

ДА ЎЛАДЫ


ФОТА З САЙТА LORAGREY.LIVEJOURNAL.COM

«Абшар беларускі — яго гаспадарка...»

Спрадвеку вядома — улада
ад Бога,
А парабак цёмны павінен
маўчаць.
Як толькі заенчыў — твой
шлях да астрога,
Да скону жыцця атрымаеш
пячаць.
Маліся, працуй і не думай
аб долі,
А лепей заўсёды цярпі
і маўчы...
Як толькі ўзбунтуеш —
пазбавішся волі,
Бо пан наймудрэйшы не
спіць і ўначы.
Чаго не хапае? Ёсць чарка
і скварка,
Здаровыя ўсе, бо ёсць толькі
«псіхоз»...
Абшар беларускі — яго
гаспадарка,
Руплівіца «бацька» — і цар,
і «заўхоз».
Прачнуліся людзі, ад сну
ачунялі,
Свой голас узнеслі да
самых нябёс,
Ад долу да свету галовы
паднялі
І змен патрабуюць без
гвалту і слёз.
Дай, Божа магутны,
усім зразумеці —
Для кожнага з нас Ён праліў
Сваю кроў,
Каб кожнаму волю і долю тут
меці,
Каб нас аб'ядналі спакой
і любоў.

Алесь КЛЫШКА

Кніга мастака і паэта са Слоніма

ПАЧАТАК НА С. 1 «АДДУШЫНЫ»

Пра мастацтва Пятро Фёдаравіч можа гутарыць бясконца. Ён заўсёды падкрэслівае, што мастацтва — «гэта яго жыццё, яго захапленне». «Малюю я алеем, алоўкам, акварэллю. Ніякія абстракцыі я не прызнаю. У мастацтве галоўнае для мяне — рэальнасць», — кажа заўсёды Пятро Фёдаравіч.

Што не ўдавалася ажыццявіць у сваіх мастацкіх творах, слонімскі мастак перадае ў вершах і апавяданнях. Нават напісаў паэму пра лёс слонімскага паэта Анатоля Іверса. Яна таксама надрукавана ў кнізе.

Цікава чытаць гумарэскі і сатырычныя вершы Пятра Бурсевіча, яны друкаваліся ў часопісе «Вожык», «Газеце Слонімскай», «Звяздзе», «Гродзенскай праўдзе». Усе яны змешчаны і ў кнізе «Сцежкі-пуцявіны».

Апошні раздзел кнігі называецца «Творчая выстава». Давайце гэты раздзел пагартаем. Вось партрэт слонімскага скульптара Леаніда Богдана, намаляваны ў 1990 годзе, вось жывапісны малюнак слонімскага касцёла святога Андрэя, 1968 года, вось малюнак «Рабакі», 2004 год, вось слонімскі вакзал (жывапіс), 1968 года... Радуюць вочы і душу карціны, прысвечаныя ваколіцам Слоніма, парку, царкве, вясне, Сынковіцкай царкве, бацькоўскай хаце, Чамярам, Слоніму...

Шмат у кнізе змешчана розных партрэтаў. Пазнаю на іх калекцыянера Міхаіла Рылко, аўтапартрэты мастака, надрукаваны прыгожы партрэт жонкі, шмат партрэтаў суседзяў, сяброў, сваякоў. Усё, што бачыў, і ўсіх, хто жыў з ім побач, і маляваў слонімскі мастак, для іх пісаў і піша свае вершы. Ёсць паэтычныя радкі, якія напісаны шчыра і па-мастацку правільна. Шмат іх прысвечана роднаму кутку:

Куточак любы — ніву, сенажаці...
Як не любіць цябе, не апяваць!
З калыскі тут мяне вучыла маці
Цябе ўсім сэрцам, край мой, шанаваць...


Альбом «Сцежкі-пуцявіны» Пятра Бурсевіча — добры падарунак нашаму сціпламу і таленавітаму земляку. Ён пабачыў свет дзякуючы дачцэ Алене Бурсевіч.


Сяргей ЧЫГРЫН

МАЛЮНКІ З КНІГІ ПЯТРА БУРСЕВІЧА


Слонім


Касцёл святога Андрэя ў Слоніме


Партрэт слонімскага скульптара Леаніда Богдана


Слонімскі калекцыянер Міхаіл Рылко

ФУТБОЛ. 1-Я ЛИГА

«Слоним 2017» в Гомеле сыграл вничью

В воскресенье, 28 июня, ФК «Слоним 2017» в 10-м туре чемпионата Беларуси в первой лиге с гомельским «Локомотивом» сыграл вничью.

«Локомотив» (Гомель) — «Слоним 2017» — 0:0 (0:0)

ФК «Слоним 2017»: Шишлов — Чудук (к), Лозко, Ровбут, Казаков, Орлов (Гузов, 78) — Силинский, Чернодаров (Фазылов, 78) — Кошель (Сикоев, 73), Артюх (Баль, 85), Сарамаха (Берг, 67).

Предупреждения: Шабанов (8), Марков (29), Лях (37), Бондаренко (43), Вашкель (48), Кухаренок (84); Сарамаха (62).

Удаления: Кухаренок (90+1)

Зрители: 150.

Борьба за мяч

ФОТО С САЙТА SPORTNAVINY.COM

В первом тайме хозяева больше владели мячом и проводили позиционные атаки на ворота гостей. Слонимчане, в свою очередь, сделали ставку на быстрые контратаки в надежде на удачную игру Мартина Артюха. Опасные моменты, которые создавали оба соперника, не привели к изменению первоначального результата.

После перерыва характер встречи сильно не изменился, только слонимские футболисты стали действовать смелее и постепенно выравняли игру.

На 79-й минуте вышедший на замену Тимур Сикоев имел реальную возможность добыть победу для своей команды, но его удар по мячу был не совсем удачным.

Концовка матча выдалась нервной, и как ни старались обе команды, им не удалось изменить счёт на табло.

Положение команд после прошедшего тура

Команды	И	В	Н	П	М	О
1 «Речицадрев»	10	6	3	1	15-9	21
2 «Сморгонь»	10	5	4	1	10-4	19
3 НФК «Крумкачы» (Минск)	0	5	2	3	21-13	17
4 «Арсенал» (Дзержинск)	9	5	2	2	14-10	17
5 «Локомотив» (Гомель)	10	4	4	2	22-17	16
6 «Волна» (Пинск)	10	4	2	4	15-17	14
7 «Гомель»	9	5	3	1	22-7	13
8 «Ошмяны-БГУФК»	10	3	4	3	14-11	13
9 «Лида»	10	4	3	3	19-18	12
10 «Слоним 2017»	**10**	**2**	**3**	**5**	**5–12**	**9**
11 «Орша»	10	3	3	4	11-13	9
12 «Гранит» (Микашевичи)	10	1	2	7	7-18	5
13 «Нафтан» (Новополоцк)	10	2	4	4	12-15	-5
14 «Химик» (Светлогорск)	10	0	1	9	3-26	-8

Результаты остальных матчей 10-го тура:

«Нафтан» (Новополоцк) — «Гранит» (Микашевичи) — 3:0 (1:0)

«Химик» (Светлогорск) — «Ошмяны-БГУФК» — 1:4 (0:2)

«Речицадрев» — «Волна» (Пинск) — 3:1(1:0)

«Гомель» — «Сморгонь» — 1:1 (0:1)

«Арсенал» (Дзержинск) — «Орша» — 1:0 (0:0)

НФК «Крумкачы» (Минск) — «Лида» — 2:2 (0:1)

В воскресенье, 5 июля, в 17:00 в Слониме на стадионе «Юность» слонимская команда встретится с НФК «Крумкачы» (Минск).

Сергей БУЗУН

ООО «Зодчий» стало лауреатом конкурса «На лучшее достижение в строительной отрасли в Республике Беларусь за 2019 год»

По подведению итогов конкурса «На лучшее достижение в строительной отрасли Республики Беларусь за 2019 год» организация награждена дипломом лауреата и памятным знаком конкурса в номинации «Организация года» среди генподрядных организаций до 300 человек.





Об организации, которая на сегодняшний день одна из немногих на строительном рынке своими силами может выполнять весь комплекс общестроительных и специальных работ под ключ, рассказывает директор Николай Николаевич Дубровский.



— Наше предприятие существует на строительном рынке почти четверть века. За эти годы мы пережили немало экономических спадов и подъемов. К сожалению, строители ощущают эти колебания в первую очередь.

Не прошел последний экономический кризис и мимо нас. Коллектив ООО «Зодчий», который насчитывал более 400 человек, имел мощную производственную базу, обладал огромным потенциалом, действительно мог участвовать в любых строительных проектах и быть полезным нашему региону, к сожалению, не нашел поддержки в трудное время и был обречен на самовыживание.

Все усилия по взысканию огромной дебиторской задолженности с промышленных, а также сельскохозяйственных предприятий нашего района равнялись нулю, их просто пустили в банкротство.

После 20 лет работы было принято решение о продаже имущества, техники, недвижимости — всего того, что предоставляло шансы на выживание.

И вот уже в течение 5 лет шаг за шагом мы восстанавливаем свою организацию, участвуем в более значимых строительных проектах.

К сожалению, пострадали не только материальные ресурсы, ушло много хороших специалистов, классных рабочих.

Я благодарен тем, кто поверил в меня в трудное время и остался, принял участие в созидательной деятельности. Также хочу сказать, что не в обиде на тех, кто покинул коллектив. Видимо, были на то причины. Мы без проблем восстанавливаем своих бывших работников.

Сегодня ООО «Зодчий» — это мобильная строительная организация с численностью 90-120 человек (в зависимости от объемов работы), которая может не только участвовать в строительстве небольших объектов, но и вести генподрядные работы на более серьезном уровне.

— С реальными трудностями Вам пришлось столкнуться лицом к лицу. Сегодня Вы по праву получили высокое признание. Как пришли к столь значимой и весомой награде?

— Вы знаете, никто к ней специально не шел. Мы просто работали, и когда получили предложение об участии в республиканском конкурсе «Лучшая организация года», немного были удивлены.

Да, у нас за последние годы был серьезный рост (из убыточности в 2016 году в последующие годы наблюдается значительный рост экономических показателей объемов, выработки, рентабельности).

Это все позволило в 2019 году достичь тех результатов, по которым и был определен победитель. Эта награда для нас очень значимая. За ней стоит тяжелый труд всего коллектива.

Хочу отметить, что она не является для нас первой. ООО «Зодчий» в 2003 году удостоено звания лауреата республиканского конкурса «Лучший предприниматель в сфере строительной деятельности». В 2004 году мы стали обладателями диплома победителя Гродненского областного конкурса «Лучший предприниматель в сфере строительной деятельности». В 2005 году по итогам республиканского конкурса «Лучший предприниматель 2005 года» получили почетный диплом лауреата за подписью Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко; в 2006 году — диплом победителя Гродненского областного конкурса «Лучший предприниматель — организатор новых рабочих мест»; в 2007 году — диплом лауреата Гродненского областного конкурса «Лучший предприниматель в сфере строительной деятельности»; в 2009 году — диплом Гродненского областного конкурса «Лучший предприниматель — организатор новых рабочих мест». Слонимским райисполкомом предприятию вручено Почетное переходящее знамя. И вот, после длительного перерыва, за итоги 2019 года предприятие награждено почетным знаком Союза строителей «За заслугі ў будаўніцтве».

— Да, путь пройден большой! Мы искренне поздравляем Вас и весь коллектив с этой заслуженной наградой! А помните ли Вы наиболее значимый для Вас объект? Возможно, объект, который дался наиболее тяжело?

— Для меня самый значимый объект — это тот, который мы строим в настоящее время. Недавно, 6 июня, мы ввели в эксплуатацию после капитального ремонта баню в г.п. Зельва, которую практически возродили. Работа была интересная.

Для своевременного ввода объекта было задействовано порядка 60 человек, приходилось работать и сверхурочно, и в выходные дни. Это был объект значимый и для нас, и для жителей Зельвы.





В настоящее время более 40 человек работает на капитальном ремонте средней школы №2 в г.п. Зельва. Как видим, все объекты одинаково значимы и требуют большой ответственности. А если вспомнить наиболее интересную работу — это крупные объекты, такие как:

— 134-квартирный жилой дом по ул. Тополевая в г. Слониме; 72-квартирный жилой дом в микрорайоне «Юго-запад» по пр. Независимости в г. Слониме; молочно-товарная ферма на 777 голов дойного стада д. Верболоты РУСП «Победитель»; торговый центр площадью 3800 м² по ул. Володарского в г.п. Островец; реконструкция здания бывшей военной комендатуры в переулке Водопроводном, 11 в г. Слониме под жилой дом.



Где имеются большие объемы, есть место самореализации, и при вводе в эксплуатацию чувствуется, что мы создали что-то настоящее. Лично для меня объект ассоциируется с живым организмом.

А насчет самого тяжелого объекта могу сказать, что не встречал объектов «легких».

— Своевременное выполнение объемов работ предусматривает наличие команды. Ведь за сдачей любого объекта стоит колоссальный труд Ваших специалистов. Как удалось собрать такой замечательный коллектив? И, что самое главное, сохранить в нынешних сложнейших условиях?

— Несомненно, от команды зависит почти все. У нас работают прекрасные люди и отличные специалисты. Слова благодарности хочется выразить прорабу Суходольскому В.В., прорабу Шишко А.Н., мастеру Болкунцу В.И., главному энергетику Позняку В.В., диспетчеру Макуца Е.В., начальнику ПТО Андреевой О.А., главному бухгалтеру Кречик Н.Г., инженеру материально-технического снабжения Лебецкой Т.В., заместителю директора по производству Малику А.С. Вместе с тем хочу отметить наших лучших рабочих. Это бригада отделочников Лагутик Е.А., каменщики — Рыбин С.В., Парфенчик М.Н., бетонщики — Яговдик А.П., Скробот В.В., плотники — Жуков С.В., Украинец А.А., электрогазосварщики — Татур В.В., Санюк Д.И., Кривда С.М., водители — Пилецкий В.И, Горбенко В.С., механизатор Мукасей Д.В.

Все эти люди — костяк организации, на который всегда можно опереться, многие из них работают почти с самого основания нашего предприятия. Для меня они стали не только коллегами, но и надежными друзьями.

— Что бы Вы хотели пожелать нашим читателям со страницы газеты?

— Сегодня довольно грустно смотреть на то, что осталось от строительного комплекса Слонима. Ушли в прошлое многие достаточно крупные предприятия, разъехались, переустроились специалисты, разваливаются производственные базы.

Строительство — это тяжелая специфическая отрасль. Работать здесь не просто, сказываются все факторы: экономические, погодные, сезонные, тендерные и др. Но самый важный — это человеческий. Когда руководитель будет беречь каждого своего работника, а руководство района каждый свой коллектив, только тогда можно поднять все на должный уровень.

Пользуясь случаем, хочу пожелать всем работникам нашего коллектива, всем строителям Слонимщины крепкого здоровья, семейного и финансового благополучия, чтобы каждый день радовал хорошими событиями, а «Газете Слонимской» — многочисленных подписчиков.

Тенденция растущих требований к стандартам качества в строительстве не дает возможности шагать неспешно или делать остановки. Это только караван в пустыне движется со скоростью самого медленного верблюда. А современный жесткий мир цивилизованного бизнеса требует умения оперативно и профессионально решать имеющиеся задачи и просчитывать перспективы развития на много шагов вперед. Это четко понимает руководитель ООО «Зодчий» Дубровский Николай Николаевич. И со здоровым оптимизмом смотрит в завтрашний день!

Беседовала Жанна БУЛАВЧИК

ВЕЛОСПОРТ

Слонимчане открыли сезон велосоревнований

После продолжительного затишья в велосипедном виде спорта наступила оттепель. На автомобильных дорогах Гродненского района 25 и 26 июня прошли первые соревнования среди юных велосипедистов. В областном первенстве участвовала команда из Слонима.



Слонимская команда



Павел Кучинский

В первый день, 25 июня, индивидуальные гонки прошли среди участников 2008, 2009 годов рождения и младше. На дистанции 5 км за медали боролись слонимчане Павел Кучинский, Алексей Михайлов (оба 2010 г.р.) и Сергей Мелешко (2008 г.р.). На пьедестал по итогу заезда поднялся Павел Кучинский. Парень показал третий результат, уступив лидеру из Гродно 11 секунд.

Семен Камендровский (2007 г.р.) принес в копилку команды 26 июня еще одну бронзовую медаль. Он преодолел дистанцию 24 км.

Трассы гонок проходили по направлению к городскому поселку Сопоцкин и Августовскому каналу.

— Для ребят это была первая гонка в сезоне. Результат показали вполне достойный. Наши велосипедисты ездят и по 40 км. Соревнованием проверили выносливость парней. Будут ли следующие соревнования и когда, пока неизвестно, — рассказал корреспонденту газеты тренер слонимской команды Александр Шиндич.

Максим СУДИЛОВСКИЙ

ЛЕГКАЯ АТЛЕТИКА

ЗАВОЕВАЛА ПЕРВУЮ МЕДАЛЬ

На минувшей неделе 25 и 26 июня на стадионе Республиканского центра олимпийской подготовки по легкой атлетике в Минске стартовал первый официальный старт этого лета — легкоатлетический турнир на призы РЦОП. За медали боролись слонимские легкоатлеты.

Воспитанница СДЮШОР №3 Слонима Александра Чура соревновалась во второй день в тройном прыжке и уступила соперницам из Витебска и Бреста.

Результат нашей соотечественницы — 12.31 м. Итоговое место на пьедестале — третье.

Не совсем удачно сложилось участие другого слонимского атлета, толкателя ядра Алексея Ничипора. В первый день, сделав три не зачётные попытки, спортсмен не попал в финальную стадию соревнований.

Максим СУДИЛОВСКИЙ



ФОТО БФЛА

Александра Чура на соревновании Eurasian Athletics Meeting U20

ФОТОКОНКУРС «ДЕТИ В КРАСКАХ ЛЕТА»

Ура! Лето! Долой заботы и дела! Привет приключениям, путешествиям и новым открытиям! Особенно для детей.



Анечка



Илья



Владислав



Софья и Александра Малашевич



Олечка



Есения Теллы



Маргарита

Мы просто уверены, что каждый день вы фотографируете своих малышей. Поделитесь самыми милыми и забавными летними фотографиями своих ребятишек и получите шанс стать победителем фотоконкурса «Дети в красках лета», который проводит «Газета Слонимская» совместно с магазином «Модные детки», ремесленником Бурсевич С.В.

Для участия в конкурсе пришлите фотографию ребенка (детей) на фоне летнего пейзажа на электронный адрес gs@gs.by, viber 8 029 133-04-21, сообщением в соцсетях «ВКонтакте» или «Одноклассники». От каждого участника принимается только одно фото.

В описании напишите, где и при каких обстоятельствах был сделан снимок, а еще немного о своем малыше (имя, возраст). Укажите свой контактный телефон для связи.

ЭТАПЫ КОНКУРСА:

С 04 июня по 16.00 часов 31 июля 2020 г. — прием заявок;

С 17.00 часов 31 июля по 17.00 часов 3 августа 2020 г. — голосование.

А 5 августа на страницах «Газеты Слонимской» Вы узнаете имена победителей.

Юлия ТОЛКУН

Рецепты клубничного варенья и секреты, которые сделают десерт идеальным



6 секретов идеального клубничного варенья

Тщательно отберите клубнику, удалите подпорченную. Если вы хотите сделать варенье с целыми ягодами, выбирайте красивые, плотные и не переспелые плоды.

Не слишком красивые, помятые ягоды подойдут для варенья с однородной консистенцией.

Мыть клубнику нужно очень аккуратно, поскольку она может помяться и стать слишком мягкой.

Некоторые советуют вообще не мыть, а просто протирать каждую ягоду влажным полотенцем. Если клубника слишком грязная, положите её в ёмкость с водой и периодически осторожно перемешивайте руками. Минут через 15-20 песок и грязь осядут на дно.

После мытья переложите клубнику на бумажное полотенце, чтобы она высохла.

Плодоножки надо удалять только у сухих и чистых ягод. Иначе клубника потеряет часть сока, а варенье получится не таким сочным и вкусным.

Чтобы разнообразить вкус варенья, в него можно добавить специи, например корицу, ваниль или кардамон, а также душистые травы, например мяту или базилик. Можно добавить их в конце или в начале приготовления. Во втором случае аромат специй и трав будет более выраженным.

Готовьте варенье в посуде из нержавеющей стали или меди. Подойдёт и эмалированная ёмкость, но при условии, что на ней нет никаких сколов.

Можно использовать алюминиевую посуду, но только если варенье варится в один приём и сразу перекладывается в другую ёмкость.

Если оно готовится в несколько подходов и остывает в той же ёмкости, в которой варилось, алюминий не подойдёт. Он может окислиться и испортить вкус варенья.

Во время варки снимайте пенку. Если её оставить, готовое варенье будет храниться меньше.

Кроме того, без пенки но получится более прозрачным, вкусным и ароматным.

Варенье из клубники и бананов

Такой десерт получается невероятно ароматным, а сладкий банановый вкус оттеняет лёгкую клубничную кислинку.

Ингредиенты
500 г клубники;
3 банана;
100 мл воды;
300 г сахара.

Приготовление

Нарежьте клубнику четвертинками, а бананы — кружочками. Влейте воду в кастрюлю, насыпьте туда сахар и, помешивая, доведите до кипения на слабом огне. Затем варите около 5 минут, пока не растворится сахар.

Снимите сладкий сироп с огня и выложите в него бананы и клубнику. Аккуратно перемешайте и оставьте остывать. После этого доведите варенье до кипения на умеренном огне, проварите 5 минут и снова остудите.

Повторите варку ещё 3-5 раз, в зависимости от желаемой густоты варенья. Чем больше варите, тем гуще получается сироп.

Варенье из клубники в мультиварке

Такой способ сэкономит вам время и силы, поскольку не придётся регулировать температуру, как это делается при варке на плите. Достаточно просто выложить все ингредиенты в мультиварку. Вкус варенья не будет отличаться от классического.

Ингредиенты
1 кг клубники;
1 кг сахара.

Приготовление

Клубнику можно оставить целой или нарезать четвертинками. Выложите её в чашу мультиварки и засыпьте сахаром. Можно немного помять ягоды толкушкой, если хотите, чтобы варенье получилось более однородным. Установите режим «Тушение» и готовьте с открытой крышкой в течение 1 часа.

Варенье из клубники без варки

Такое варенье называют сырым. Его можно съесть сразу или заморозить в целлофановых пакетах и наслаждаться зимой практически свежей клубникой.

Ингредиенты:
1 кг клубники;
700-800 г сахара.

Приготовление

Засыпьте ягоды сахаром и разомните их толкушкой. Для этого можно также воспользоваться блендером. Лучше не перетирать ягоды в пюре, а оставить небольшие кусочки. Так варенье будет выглядеть интереснее. Оставьте его на несколько часов, чтобы полностью растворился сахар.

lifehacker.ru

Подготовила Анна ВОЛОДАЩУК
anna@gs.by

НА ПОЭТИЧЕСКОЙ ВОЛНЕ

ЛЮДЯМ В БЕЛЫХ ХАЛАТАХ



Кто в отпуске гуляет в Ницце.
Курортов карта не мала.
Я оказался в райбольнице,
Простуда-ведьма завела.
В благоустроенных палатах
Здесь можно встретить хоть кого:
Рабочего, интеллигента,
Был и слуга Всевышнего.
Хоть депутатам в неугоду,
Я не хочу их осуждать,
По правде слугами народа
Людей в халатах надо звать.
Врачи, медсёстры, санитары,
Кто к нам всегда спешит в беду.
Не важно, нищий или старый,
Всегда найдёшь их на посту.
Не глядя на гражданский статус,
Служитель муз иль из тюрьмы,
Хоть из депутатской ты палаты —
Перед болезнью все равны.
Упрёки, низкая зарплата,
Нехватка кадров по местам,
Хвала вам, люди Гиппократа,
От всей души спасибо вам!

Виктор ЯНУЧЕНЯ



ПАМЯЦЬ

ПЕРАМОЖЦЫ

Героям-Пераможцам той Вялікай вайны, усім-усім ветэранам, знявечаным і скалечаным на той вайне, усім тым, каго страшныя раны, нечалавечыя пакуты і боль, фізічны і маральны, літаральна выкасілі ў 50-70-х... Усім тым, з кім звёў мяне мой дзіцячы лёс, вачам і душам усіх тых, хто глядзеў мне проста ў маё раскрытае сэрца ў пачатку сёння ўжо такіх далёкіх і пасляваенных, але пякучых на ўспаміны 60-х, усім тым, каму сёння мы проста ўсе абавязаны шчасцем свайго жыцця і існавання — прысвячаю...


ФОТА: ТАСС

Салдаты ідуць на фронт. Ілюстрацыйнае фота

Я помню Вас, бязрукіх і бязногіх,
Скалечаныя твары, без вачэй.
Пратэзы валаклі Вы па дарогах,
І медалі брынчэлі ўсё званчэй...

Знак той Бяды, Вы тухлі як акуркі,
Выкідвалі ўдовы кастылі...
А ўнукі, ужо сучасныя прыдуркі,
Папрадавалі Вашы медалі...

Радзіма, што Герояў прычакала,
Была як злая мачыха падчас:
Грашыла, тым калекам махлявала,
І Пераможцы плакалі не раз...

Вайна пякла... Вы раны замывалі,
Пад плотам скавыталі сотні раз...
Абрубкі Вашы п`яныя ляжалі...
Шчаслівым, нам было ўжо не да Вас...

З Героямі стагналі і матулі,
За Боль праклёны клалі на мяжы...
І з Пераможцамі-калекамі заснулі.
Згнілі, ушчэнт сатлелі іх крыжы.

...Была вайна... З вялікай той бядою
Вякі і нам, і нашым дзецям жыць...
Ды толькі пад фанфары, са слязою,
Вас, Пераможцы, не падняць, не ажывіць...

У шчодрасці падзякаў нашых танных
Мільёны з Вас паспелі дагарэць...
Не згладзім ні пакут, ні Вашы раны,
Не зможам Вам у вочы паглядзець...

І сёння, трыумфальна, перад Богам,
Крычу сваім нашчадкам і вякам:
Вы, Пераможцы, здабылі нам Перамогу!
І на каленях плачу: Слава, Слава Вам!

Алег ЯНУЛЬ-ВЕНСКІ

ПАЗНАЙ СЯБЕ НА ФОТА

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-999, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Найбольш цікавыя расповеды пра герояў здымкаў будуць надрукаваны ў газеце, а іх аўтары атрымаюць запрашальныя квіткі на спектаклі Слонімскага драматычнага тэатра.



Хлопцы з ПТВ


Мужчыны летам на лодцы

На фотаздымак мужчын летам на лодцы, надрукаваны ў мінулым нумары «Аддушыны», адгукнуўся наш чытач Віталь Фядотаў.

— У цэнтры на фотаздымку я. Ззаду за мной — Андрэй, які, здаецца, і цяпер працуе выратавальнікам Таварыства выратавальнікаў на вадзе. Справа сядзіць Хомчык, калі не памыляюся, завуць яго Ігар. Здымак гэты зроблены на Шчары на гарадскім пляжы недзе ў пачатку 90-х гадоў, — расказаў Віталь.

Напярэдадні выхаду газеты ў рэдакцыю патэлефанаваў з Санкт-Пецярбурга адзін з герояў фотаздымка мужчын летам на лодцы, Генадзь Кашубовіч.

— На гэтым здымку я пазнаў сябе і іншых нашых выратавальнікаў са Слонімскай выратавальнай станцыі пачатку 90-х гадоў. Злева направа на лодцы сядзяць Руслан Антонік (Русік), у цэнтры з шапкай я, справа Хома (здаецца, прозвішча яго Хомчык), ззаду вадалаз Ціма, так мы яго звалі. Наогул, матросам-выратавальнікам на станцыі быў толькі я, астатнія трое хлопцаў — вадалазы. Іх часта выкарыстоўвала міліцыя для пошуку тапельцаў пад вадой. Хачу сказаць, што мы ў той час часта ратавалі дарослых і дзяцей, якія тапіліся ў Шчары, — распавёў па вайберы Генадзь Кашубовіч.

Нашы чытачы Андрэй Астапенка і Людміла Хвесяня пазналі міліцыянера-кінолага з «Аховы» Леаніда Кліманцова на фотаздымку ў №25. Свайго мужа, колішняга начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела Слонімскай фабрыкі гасцінічнай мэблі, Віктара Цімафеевіча Собалева, на фотаздымку з №24 пазнала яго жонка Валянціна Іосіфаўна. Пабач з мужам Валянціна Іосіфаўна пазнала таксама Мікалая Пузырова, які працаваў сталярам на КПЗ.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФОТА З АРХІВА «ГС»

Глыбокая каляіна

Ледзь толькі прачнуўся гультаяваты лістападаўскі дзень з нізкімі хмарамі, што гатовы былі праліць халодны дождж, салдацкая ўдава Маня Купельская папрасіла ў брыгадзіра каня, каб з`ездзіць у недалёкі лес па сухастой, які нарыхтавала на мінулым тыдні.

— Дарога размыта, бо гэтак лілі дажджы, а конік слабаваты, глядзі, каб воз не заграз, — папярэдзіў.

— Я асцярожненька... Ехаць трэба, бо дровы ўжо канчаюцца, а неўзабаве халады.

Маня пакінула з суседкай Нінай свайго пяцігадовага сыночка Віцю, узяла ў дрывотні сякеру і пілу, каб яшчэ спілаваць якую сухастоіну, і падалася ў лес. Села на воз — высокая, худая, з упалымі вачамі, але такімі прыгожымі, чорнымі, нібы ноч.

«Сама як тая сухастоіна, — не раз думала з горыччу. — І не дзіва, бо ў дваццаць пяць гадоў, як прыйшла пахавальная на мужа, засталася адна. Вайна закончылася, многія вярнуліся, а мой Максім ужо ніколі не вернецца...»


Неўпрыкмет заехала на вузкую дарожку, па невысокім кустоўі з цяжкасцю павярнула каня назад і пачала цягаць ды складваць сухастой. Спілавала яшчэ адну елачку, з якой ужо асыпалася ігліца, прыладавала зверху. Склала ўсё акуратна, каб не раз`ехалася, а потым яшчэ перавязала вяроўкай.

«Цяпер надзейна, — падумала, выціраючы з высокага лба пот. — Пакуль не нападаў снег, трэба будзе яшчэ вазы са тры назбіраць, каб зімой не цягацца. Тут дроў хапае. Але гэта ўжо як падмерзне, бо ўперадзе надта ж глыбокая каляіна, каб хоць не загразнуць».

Сівы конік паволі цягнуў воз. Калі пад`язджалі да каляіны, Маня скіравала ўправа, каб абмінуць, але заднія колы такі з`ехалі.

— Конік, міленькі, пастарайся, — прасіла Сівога, нібы ён мог зразумець. Крыху, зусім нямоцна, шкадуючы, шлягнула па крупе лейцамі. Ён натужна рвануўся, патупаў, але воз — ні з месца.

— Усё, трапілі мы з табой у пастку... — прамовіла са слязамі.


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

— Што, гаспадынька, кажаш, не пашанцавала? — побач стаяў малады мужчына ў шынялі з рэчавым мяшком за плячамі. Высокі, статны, з-пад салдацкай пілоткі віднеліся сіваватыя валасы.

— Ой, не ведаю, што і рабіць...

— Не бядуй, дамо рады, — бадзёра сказаў незнаёмец.

Ён скінуў рэчавы мяшок, зняў шынель.

— Дай, гаспадынька, сякеру. Трэба падкласці пад колы галля, скінуць з воза палову дроў, і тады твой конік з нашай дапамогай здолее выцягнуць.

Калі воз ужо стаяў на цвёрдай зямлі, мужчына апрануўся, узяў свой мяшок.

— Дзякуй... Такая глыбокая каляіна, без вас я тут прамучылася б да вечара.

— Ну, значыць, вам са мной пашанцавала, — усміхнуўся ён.

Конь цягнуў воз, а яны ішлі крышку ззаду і размаўлялі. Іван Суражскі, так звалі салдата, ішоў у вёску Беражкі.

— У мяне ўся сям`я загінула: і жонка, і сынок... Хату немцы спалілі. А ў Беражках жыве цётка, родная бацькава сястра. Думаю, пакуль што ў яе пажыць.

— Дык і я ж з Беражкоў! — Маня ажно прыпынілася. — А як завуць цётку?

— Вера Нічорская.

— Памерла яна яшчэ летам...

— Не ведаў... Цяпер трэба назад варочацца, але куды падацца?

— Жывіце ў мяне, Іван, — раптам нечакана для сябе прапанавала Маня. — Перазімуеце, а потым будзе відаць...

— Буду ўдзячны за прытулак. Я не сядзецьму склаўшы рукі. Што трэба ў гаспадарцы — зраблю, у калгас на работу стану хадзіць.

Пакуль не наступілі маразы, Іван нацягаў з лесу моху, кастрыцы і ўцяпліў прызбу, паправіў дзверы ў хляве, а потым пайшоў у калгас на розныя работы.

Манін сынок Віця хутка пасябраваў з дзядзькам Ванем, пачаў называць яго таткам. Маня за ім пачувалася спакойна і ўпэўнена, не ведала, як дзякаваць Богу за такога слаўнага чалавека.

Вясной, калі прыйшла пара брацца за агароды, Іван узяў у калгасе каня і ўзараў участак пад грады і бульбу, потым разам з Маняй пасадзілі ўсё.

— Трэба яшчэ прывезці той воз дроў, што нарыхтаваны. Тры перад зімой прывезлі, а чацвёрты застаўся, — прапанаваў Іван.

Яны прывезлі і складвалі пад дрывотняй, каб падсохлі. І не заўважылі, як на падворак зайшла жанчына. Невысокая, спрытная. Сама маладая, а валасы сівыя...

— Ванечка, родненькі! І праўда жывы! Сказалі, а я не паверыла, — кабета падбегла да Івана і кінулася яму на шыю. Абняла так, што, здаецца, ніякая сіла не змагла б адарваць.

Ён гладзіў яе па галаве, і з вачэй каціліся слёзы.

— Кацечка, жывая... — шаптаў як у сне. — А сынок жа дзе?

— І ён жывы. У мацеры пакінула, а сама сюды, — затуманеныя слязамі вочы жанчыны свяціліся шчасцем.

— Гэта жонка мая, Кацярына, — патлумачыў Іван. — А гэта Маня, яна прыняла мяне, калі не было дзе галаву прыхіліць, бо людзі сказалі, што вы з сыночкам загінулі, а хата згарэла. Я сам быў у нашай вёсцы і бачыў.

— Мы цяпер у мамы ў Стайках... Пойдзем жа, Ванечка, хутчэй на станцыю, наш цягнік праз паўтары гадзіны.

Маня была ў роспачы. Як не сваім голасам прапанавала:

— Ідзём жа ў хату... Паешце з дарогі... і на дарогу...

Есці яны не сталі, толькі Іван збегаў у хату і забраў свае рэчы.

— Дзякуй, Манечка, што дала прытулак. Не забуду тваёй дабрыні ніколі... — сказаў ціхім голасам.

Яны пайшлі. На павароце вуліцы Іван азірнуўся, памахаў рукой. І яна памахала ў адказ.

— Вось зноў я апынулася ў глыбокай каляіне... — падумала, глытаючы слёзы. — І цяпер ужо ніхто не паможа выбрацца да сконy дзён.

І раптам праменьчык надзеі. А дзеткі ж! І Віця, і той сынок ці дачушка, што павінен нарадзіцца.

— Твой татка пра цябе і ведаць не будзе... Ды нічога, мы і адны справімся, — шаптала, і ў яе голасе горыч была перамешана з радасцю...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Афиша

Слонимский драмтеатр

4 июля, суббота

Для взрослых премьера спектакля «Белый лист». Начало в 16.00. Цена 7 руб.

5 июля, воскресенье

Для детей спектакль «Золотой цыплёнок». Начало в 12.00. Цена 4 руб.

Слонимский центр культуры и отдыха

Кинозал

4 июля, суббота

12.00 «Тайна Мосли» 2D (Новая Зеландия, 6+, мультфильм, 01.36) 3 руб.

14.00 «Красные туфельки и семь гномов» 2D (Корея, 6+, мультфильм, 01.32) 3 руб.

16.00 «Пушистые мошенники» 2D (Германия, 6+, мультфильм, 01.21) 3 руб.

18.00 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 01.30) 4 руб.

20.00 «Пушки Акимбо» 2D (Великобритания, 18+, боевик, 01.38) 4 руб.

5 июля, воскресенье

12.00, 18.00 «Пушистые мошенники» 2D (Германия, 6+, мультфильм, 01.21) 3 руб.

14.00 «Тайна Мосли» 2D (Новая Зеландия, 6+, мультфильм, 01.36) 3 руб.

16.00 «Красные туфельки и семь гномов» 2D (Корея, 6+, мультфильм, 01.32) 3 руб.

20.00 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 01.30) 4 руб.

7 июля, вторник

12.00 «Красные туфельки и семь гномов» 2D (Корея, 6+, мультфильм, 01.32) 3 руб.

14.00 «Пушистые мошенники» 2D (Германия, 6+, мультфильм, 01.21) 3 руб.

16.00 «Тайна Мосли» 2D (Новая Зеландия, 6+, мультфильм, 01.36) 3 руб.

18.00 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 01.30) 4 руб.

20.00 «Пушки Акимбо» 2D (Великобритания, 18+, боевик, 01.38) 4 руб.

8 июля, среда

12.00 «Тайна Мосли» 2D (Новая Зеландия, 6+, мультфильм, 01.36) 3 руб.

14.00 «Красные туфельки и семь гномов» 2D (Корея, 6+, мультфильм, 01.32) 3 руб.

16.00 «Пушистые мошенники» 2D (Германия, 6+, мультфильм, 01.21) 3 руб.

18.00 «Пушки Акимбо» 2D (Великобритания, 18+, боевик, 01.38) 4 руб.

20.00 «Обратный отсчёт» 2D (США, 16+, ужасы, 01.30) 4 руб.

Главный редактор Николай Николаевич Кононович

Учредитель Анна Павловна ВОЛОДАЩУК

Телефоны редакции:
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до 18.00
Skype — gazslon

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Свободная цена

Тираж номера 2500 экз.

Время подписания к печати по графику 30 июня 2020 года 17:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8(044) 715-90-03
8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03
ул. Красноармейская, 41
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
ЛП №02330/39 от 27.03.2014
Заказ № 2858

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362



